

**Марыя Цімінская**

# Засечкі на сэрцы, засечкі на памяці

**Студзень 1995 г. –**
**студзень 1996 г. –**
**30 чэрвеня 1996 года**

**1943 год 13 студзеня. Ноч**

Прачнулася. Гарыць лямпа. Бацькі і бабуля не спяць. У хаце некалькі чужых мужчын. Я ўжо ведаю, што гэта партызаны. На стале вялікі чыгун з варанай бульбай.

- Мамаша, сделайте пюре. Вот тушенка, - кажа адзін з партызанаў.

Я сяджу на ложку, абхінуўшыся коўдрай. Бабуля таўчэ ў чыгуне бульбу. Мама падыходзіць да мяне:

- Чаму ты не спіш, дачушка? Спі.

- Мама, я хачу пюрэ, - шапчу я. Мама прыносіць мне ў місачцы тоўчанай бульбы, запраўленай тушонкай. Я ем. Калі мама падыходзіць забраць пустую місачку, ціхенька кажу ёй: - Мама, а дзе пюрэ? Гэта ж камы. Мама лагодна ўсміхаецца і гладзіць мяне па галаве.

Ні яна, ні я не ведаем, што ўсміхнулася яна мне і пагладзіла па галаве апошні раз. Заўтрашні дзень разлучыць нас навекі.

***

**1943 год 14 студзеня. Дзень**

…Я па полю бягу,
Ножкі грузнуць у снезе.
Свішчуць кулі вакол,
Трэ схавацца мне недзе!
Мусіць, Бога рука
Мне, малой, памагае:
З агарода ўжо
У свой двор забягаю.
У двары – ні душы…
Йсці баюся ў хату:
З хаты ж выгналі нас…
А дзе ж мама? Дзе тата?
Во страляюць яшчэ…
Не, баюся ў хату…
І залажу ў хляўчук,
Дзе ў нас парасяты.
Доўга ціха стаю…
Зноў на вёсцы страляюць…
Здэцца мне, быццам я
У хаванкі гуляю…

Зноў чарга з кулямёта…
Хачу к маме, дамоў!
Не… во тупаюць боты
У двары за сцяной…
Тупат цяжкі і страшкі.
Скамянеўшы, стаю.
Не пішчаць парасяткі
(Мне жыццё зберагуць).
Змерзлі ручкі ў мяне.
Я іх моцна кусаю,
Шчэ кусаю і шчэ –
Болю не адчуваю.
Ціха хліпаю ўжо.
Па шчаках слёзы мажу.
Але з хлеўчыка я
Усё чамусь не вылажу.
***
Здэцца ўжо не страляюць?
Цішыня за сцяной?
Адчыняю й выходжу…
Ну, пайду ўжо дамоў.
Баючыся, іду
Уздоўж хлева, да хаты… –
Ля парога ляжаць
Мама, бабка і тата.
Я стаю, пазіраю:
Снег навокал чырвоны,
І яны ўсе чамусьці
Ляжаць нерухома.
Зараз збегаю ў хату,
Трэбы ручкі пагрэць…
***
На ўсю хату крычу:
– У мяне ручкі баляць! –
А яны не ўстаюць,
Не бягуць ратаваць.
Ой, як ручкі шчымяць,
Аж няма куды дзецца!
Моцна плачу і грэю



У вадзе ў вядзерцы.
***
Я ізноў на дварэ –
Ўсе ляжаць, як ляжалі.
Ля іх тупаю я –
Хоць бы слоўка сказалі.
Каля мамы саджуся
І яе абдымаю,
Плачу горка, яе
Галаву падымаю.
Мама ўсё не ўстае
І маўчыць анямела.
Я бяру за руку –
І рука скамянела…
Каля стопкі на снезе
Анютка малая.
Я на ручкі бяру –
Ды яна… нежывая.
Ужо не ўстануць яны,
Я падняць іх не ўмею!
Сваім сэрцам дзіцячым
Бяду разумею.
Пабягу к бабцы Мар’і,
Хай яна дапаможа…
Усё kроў на снягу…
(Божа, Божа мой, Божа!..)
***
Да бабулі заходжу,
У яе ў печы гарыць…
А бабуля ля печы
На падлозе ляжыць.
Ля стала цётка Надзя
Неяк бокам прылегла,
Мне здалося, яна
Быццам некуды бегла.
У калыску гляджу –
Там малая Раіска.
Ды забілі й яе,
У крыві ўся калыска…

***

Зноў па вуліцы я
Уздоўж плоту бягу
І крычу колькі сілы…
Kроў і кроў на снягу…
Што рабіць? Куды дзецца?
Я на свеце адна?!
Ціха-ціха ў вёсцы,
У канцы хаты гараць…
Куды вочы глядзяць
З плачам-крыкам бягу…
Што зрабілася ў вёсцы,
Зразумець не магу…
Толькі бабка-суседка
Мяне пераймае:
– Ціха, ціха дзіцятка! –
Да сябе прыхінае, –
Хадзем, дзеткі, са мной,
Хадзем, Манечка, ў хату…
Не падымеш ужо
Ты ні маму, ні тату.
Ціха, дзеткі, не плач…
Не падымецца матка…
Ты сіротка цяпер…
А маё ж ты дзіцятка!..

***

**<u>1943 год 15 студзеня. Дзень</u>**

– Ідзі, дзіцятка, дадому, надзенься цяплей. Пойдзеце з Мішам на пасёлак. У цябе там дзядзька, у яго цётка, – кажа бабуля Макарыха.

Я іду з аднаго канца вёскі ў другі, у свой канец. На дварэ ля парога ляжаць мае родныя. Ляжаць так, як ляжалі і ўчора. Заходжу ў хату. Пачынаю збірацца ў дарогу. Бяру ўсё самае каштоўнае для мяне, пяцігадовай дзяўчынкі. Забяру сваю ляльку, адэкалон, фотакарткі. Яшчэ хачу забраць крыжык, маленькі крыжык на ружовай стужачцы. Было, што бабуля давала мне яго патрымаць у руках, надзець на шыю. Ведаю, што чалавек на крыжыку – гэта Ісус Хрыстос, што на адваротным баку крыжыка напісана “Спаси и сохрани”. Мне вельмі падабаліся і крыжык і ружовая стужачка, на якой ён вісеў. Крыжык

быў у прыскрыначку бабулінага сундучка, дзе ляжала яе смярцёная адзежа. Але цяпер яго тут няма. Я зноў перабіраю ўсё ў прыскрыначку – крыжыка няма.

Завязваю маміну цёплую хустку. Заходзіць бабуля Макарыха. Надзявае на мяне маміну жакетку, падпяразвае. – Хадзем, Манька, трэба ісці. Мы выходзім. На дварэ ля парога на хвіліну спыняемся. Стаім, маўчым. Бабуля бярэ мяне за руку, і мы ідзем да варотцаў.

Больш у родную хату я ўжо не вярнуся. Яе не будзе. Гарожу спалілі.

***

## А яно не ідзецца…

Нас правялі за вёску, паказалі дарогу. Мы з Мішам пойдзем на пасёлак. Там у нас радня.

Ідзём. Вельмі халодна. Пройдзем трохі і спынімся… Я ўжо не хачу ісці. Міша цягне за руку: - Хадзем! – Давай лепш пойдзем дамоў, – кажу я. – Не, трэба ісці на пасёлак. Дома ўсе пабітыя…

Зноў ідзём. Халодна. Дарога вельмі доўгая. Зусім надакучыла ісці. Я хачу сесці. Міша не дае садзіцца, кажа, што трэба ісці. Але я не іду. Тады Міша становіцца ў мяне за спіной і паціху папіхае у плечы, каб ішла…

Так мы і ідзём… Я ўжо больш не магу ісці. І Міша стаміўся. Мы садзімся ўзбоч дарогі. На снег. І сядзім… Колькі сядзім, не ведаю. Але нам ужо стала цёпла і добра. Хочацца спаць…

Падабрала нас жанчына с пасёлка Май, Каця Юліна. І прынесла на пасёлак Акцябар. Да майго дзядзькі.

P.S. За сынам Каці Юлінай замужам дачка Івана Альферовіча, майго дваюроднага брата – сына дзядзькі Мішы.

***

## Плачу і чакаю

Я жыву ў дзядзькі Мішы на пасёлку Акцябры. Мне ўвесь час сумна. Я кожны дзень плачу. Ціхенька плачу і плачу. Я вельмі хачу дамоў к маме.

Мяне спачатку просяць не плакаць, стараюцца як-небудзь развесяліць. Але я плачу.

Цераз вуліцу, насупраць, жыве старэйшая дзядзькава дачка Марыя. Яна ўжо замужам. Марыя вядзе мяне да сябе ў хату. Адчыняе сундук. Дае мне розныя прыгожыя абрэзкі. Раней для мяне гэта было

б вялікае багацце. Колькі б новых сукенак я нашыла сваёй ляльцы! А цяпер яны мяне не цікавяць.  Я адварочваюся. Марыя дае мне іх у рукі. Але рукі маі чамусьці вялыя, не трымаюць. Абрэзкі падаюць у сундук. Яна зноў дае, а яны зноў валяцца з маіх рук. Я не хачу іх, яны мне не трэба. Я хачу дамоў, к маме…

Угаворванні не дапамагаюць. Пачынаюць трохі гразіцца, каб перастала плакаць. Тады я знаходжу выйсце. Надзяваю сваю світку, буркі і іду на двор. Схаваюся за хлевам ці за хатай і плачу.

А калі бывае мяцеліца, і вецер свішча ў галінах дрэў і кустоў, тады я доўга стаю на дварэ і пільна ўглядваюся ў мутную далячынь, у бок Гарожы. І чакаю. Чакаю, што мае родныя зараз з’явяцца з гэтай кругаверці, вернуцца з таго страшнага, незразумелага дня.

Я чакаю іх. Ну, павінны ж яны вярнуцца! Як жа я буду адна тут?!

***

**<u>1943 год 11 студзеня</u>**
**<u>(за тры дня да трагедыі)</u>**

Прыснілася, што мяне ніхто не любіць, што я нікому не трэба. Мне вельмі горка і крыўдна ад маёй адзіноты. Я моцна плачу і цiснуся ў куток на ложку, у нагах у мамы. Скурчылася і цiснуся.

Мама з бабуляй прачнуліся ад майго плачу. Цягнуць мяне да сябе. А я ўжо і не сплю, але суняцца не магу, усё роўна плачу і цiснуся, гатовая ўпляскацца ў спінку ложка. Душыць крыўда адзіноты, нейка страшнай і незразумелай мне адзіноты.

Праз тры дні сну майму наканавана было збыцца. Я засталася адна. Назаўсёды адна. Адзінота са мной на ўсё жыццё. А іх няма.

***

На струнах маёй душы
Люляецца адзінота,
Трымціць мінорная нота
На струнах маёй душы.
Бяруць акорды ў цішы
То журбота, а то гаркота.
На струнах маёй душы
Люляецца адзінота.

x x x

Мама
Ніна Мікалаеўна
Альферовіч (Патапейка)

Мне здаецца, што я помню яе твар. Але, мусіць, толькі здаецца. Хутчэй за ўсё я ведаю яго па фотаздымках, што вынесла з пякельнага студзеня.
Маму звалі Ніна, а яшчэ і Макрына.
Помню гэта.
Маладая. Даволі высокая, з доўгімі валасамі, якія яна збірала і закручвала на патыліцы ў „куклу". Пішу, што помню.

x x x

***

Сяджу на прызбе каля парога хаты. Гуляю з лялькай. Сонейка грэе. Сцяна хаты цёплая-цёплая. Мама выходзіць з хаты и кажа: – Хадзем, Манька, са мной на поле, калі хочаш. Я хуценька бягу за ёй. Як сёння перад вачыма той цёплы дзянёк. Сонечна-сонечна. Так бесклапотна-радасна. Мне.

Ідзём з мамай па разоры. Ля ігрушы-дзічкі расце мышыны гарошак. Зрываю кветачкі, нясу ў жменьцы. На поле яшчэ збіраю ружовыя гваздзічкі, нейкія жоўтыя кветачкі. Збіраю букет.

***

Аднойчы прачнулася, а ў хаце бабуля Мар’я Дужыха і мая бабуля Ганна абмяркоўваюць здарэнне. З іхняй размовы вот што зразумела. Бабуля ідзе на двор, а дзверы адчыніць не можа. Так-сяк адпіхнула, а ля дзвярэй у сенцах мама ляжыць у непрытомнасці. А яшчэ яны казалі, што на гэты раз у мамы народзіцца хлопчык. Я сабе і адзначыла: “Во, брацік у нас будзе”. Забілі маму, а з ёй забілі жаданага браціка, які не нарадзіўся.

***

– Ідзі, Манька, расчашу валаскі! – гэта мама мне. Але я не іду: я не люблю расчэсвацца, бо валаскі даволі доўгія, і калі мама расчэсвае, дыу тузае, мне баліць. Вось і не іду. А хачу ўцячы за дзверы. Ды не ўдаецца. Мама ловіць за руку, бярэ трапкач і “абганяе пыл” з Манькі. Во так Маньцы-неслушы! Ставіць каля сябе і расчэсвае.

***

Чырвоная субота. Я сяджу на пячы, выглядваю з-за коміна, жую сушаныя ігрушы-дзічкі, якіх за комінам на паліцы стаіць цэлы мех.

Мама на падлозе перад печчу лушчыць шалупінне з цыбулі. Будзем красіць яйкі! І цяпер помню пах цыбульніку, таго цыбульніку, мамінага.

***

Помню, як мама садзілася і расчэсвала свае русыя валасы. Доўгія, густыя прыгожыя. Кожную раніцу.

У 1956 годзе летам мне прыснілася мама. Адзін раз за ўсё жыццё. У нашым канцы вёскі – загон жыта. (На самай справе там лаза і вясной – кураслеп). Яно яшчэ палавое тое жыта, недаспелае. Загон абгароджаны дротам. У канцы загона – трава зялёная і пень. На ім сядзіць мама і расчэсвае валасы. Я стаю побач. Мама і кажа: “Трохі недаспелае жыта, але будзем жаць, дачушка”.

Жанчыны разгадалі гэты мой сон так: Я хутка пайду замуж, мама дае мне сваё благаславенне. (Які замуж? У мяне і хлопца такога няма, каб замуж браў). Але так і было. Праз тыдзень я пазнаёмілася на вечарынцы у Малой Гарожы з Пецем Падвойскім. А ў снежні (31 снежня 1956 года) я і пайшла за яго замуж.

P.S. Чаму больш не сніцеся мне, мама? Мне так цяжка без Вас на свеце. Усё жыццё мне Вас не хапае. Ці хто ведае, як гняце мяне ўсё жыцце пажар майго сіроцтва?!

***

## <u>Тата</u>

## <u>Павел Сцяпанавіч Альферовіч</u>

Тату помню так: светлыя валасы, светла-блакітныя вочы. Высокі і стройны.

Сядзіць за сталом ля вакна. нешта піша ў нейкі вялікі журнал. У журнале ружовыя лініі. Мне яны вельмі падабаюцца. Я таўкуся каля стала. Тата бярэ мяне на калені. Смяецца і кажа, што ў мяне зусім малы нос. Кажа, што калі я нарадзілася, дык носа ў мяне зусім не было, і што ён нават хацеў пад плот выкінуць такое безносае дзіця. Але цяпер рад, што не выкінуў, што прыгожая дачушка ў яго расце. І нос ёсць. Толькі малы.

***

Помню як бацька прыйшоў з салдатаў. (Не ведаю з якіх, але так казалі). Мне ён прынёс вялікую прыгожую лялньку і невялікі драўляны сундучок поўны цукерак.

Лялька такая, куплёная, была толькі ў мяне адной на ўсё сяло. Дзяўчынкі-равесніцы заўсёды прасілі патрымаць у руках маю ляльку, калі я выходзіла з ёю на вуліцу. Яе я і вынесла з сабой, калі Гарожу маю забілі.

Вось і ўсё, што помню пра бацьку. Не! Яшчэ яскрава помню, як ён ляжаў забіты: на спіне з прастрэленымі грудзямі, распластаўшы рукі.

Вялікі і стройны.

***

## Таня

Нас было трое, тры дзяўчынкі: я старэйшая, потым Таня і меншанькая – Анютка.

Таня наша памерла. Помню пахаванне. Маленькая труна стаіць пад абразамі, маленькая дзяўчынка ў ёй. Каля галоўкі кветачкі. Касмеі. Я сама іх рвала. Іх паклалі Тані ў труну.

***

## Анютка

Анютка зусім малая, не ўмее поўзаць, толькі сядзіць на падлозе сярод хаты на разасланай дзярузе, гуляе з цацкамі.

Мама з бабуляй пашлі жаць жыта. Я ж павінна глядзець Анютку. Нас замкнулі, каб мы былі ў хаце. Але мне надакучыла няньчыцца з малою. Я кладу ля яе нейкія там цацкі. Сама адчыняю акно, вылажу і бягу гуляць з дзяўчынкамі. Думаю трошкі пагуляю, але забылася, загулялася. Гляджу – мама з бабуляй ідуць дадому. Дык жа не пабегла дамоў Манька, а пабегла за сяло і схавалася ў яме, з якой гліну капалі. Сяджу.

Ходзяць, шукаюць-гукаюць. Кажуць, каб ішла дадому, што біць не будуць, што бабуля малін прынесла. – Ведаю, якія маліны! Трапкача дасце, - думаю я, - седзячы ў яме. Знайшлі, вядома. Не, не білі. Сапраўды малін з малаком далі.

А трапкача, пэўна, трэба б было даць!

Калі нас забівалі, Анютка ўжо ўмела хадзіць. На двор, як нас выгналі з хаты, бацька нёс яе на руках! Раздзетыя. Апрануцца не далі.

(А навошта? Забойцы же ведалі, што робяць). Анютка была ў адной сукеначцы.

Потым, калі я поўзала каля іх, забітых, так і ляжала яна ў адной сукеначцы на гуры снегу ля стопкі.

Раней, калі я брала яе на ручкі, яна ашчапервала мяне за шыю. Цяпер жа падымаю, а яе маленькія ручкі вісяць. Яна нежывая. Я кладу яе зноў на снег. Ран на ёй няма. Толькі на ножцы невялікая драпіна.

І ўсё. Нёс тата. А ляжыць чаму на стопкі, далёка ад іх? Ран няма. А чаму нежывая? На гэтыя мае пытанні не адкажа ўжо ніхто і ніколі.

***

## **Бабуля Мар'я**

Мар'я Змітраўна Падвойская – Мар'я Патапейка – Мар'я Мікалаіха – гэта ўсё яна, мая бабуля Мар'я. Жыла яна з сынам (маім дзядзькам Пецем, матчыным братам) і з нявесткай Надзяй. Хата яе была далекавата ад нас, недзе на сярэдзіне вёскі. Мы ж жылі ў канцы вёскі. Дзеда Мікалая, як і дзеда Сцяпана, я не помню. Я іх не ведаю. І не расказваў ніхто мне, дзе яны і што. Думаю, памерлі да вайны. А мо і не так. У бабулі Мар'і быў адзіны на ўсю вёску сад. Шмат яблыкаў было. У нас жа на агародзе расла толькі адна ігруша-дзічка. Вялікая, старая. На ёй была калода з пчоламі. Кім пасаджана ігруша? Не ведаю. І ніхто не раскажа. Ды й няма ўжо яе, маёй ігрушы-дзічкі, якая адна ішла са мной па жыцці пасля таго пякельнага студзеня. Прыеду, бывала, вясной у сваю Вялікую Гарожу (як ужо вучылася ў педвучылішчы), і сустракала мяне высокая белая-белая, уся ў квецені ігруша-дзічка. Усё, што засталося ад нашага вялікага роду, загубленага вайной, – я і дзічка.

…Тваё сэрца ад болю
І апёкі на голлі
Студзій студзеньскі вецер.
А вясной, як заўсёды,
Па закону прыроды
Ты прыбралася ў квецень…

Сама сабе я ўвесь час здаюся той дзічкай.
Такія вось асацыяцыі.

***

## **Бабуля Ганна**

Ганна Музычыха. Так звалі на сяле маю бабулю па бацькавай лініі Ганну Аляксееўну Альферовіч. Дзед Сцяпан быў добры музыка, казалі. Іграў на цымбалах, на скрыпцы, на гармоніку. Усе вяселлі у наваколлі іграў мой дзед Сцяпан. Нас усе так і звалі Музычэнкамі: Павел Музычэнак, Ганна Музычыха, Маня Музычэнкава (гэта я).

Помню, як мы з бабулей Ганнай сядзім на печы зімовымі вечарамі. Лузгалі гарбузікі. Я грызла сушаныя ігрушкі-дзічкі. Бабуля расказвала казкі. Якія? Не помню, сцерліся з маёй памяці. Але вось гэта, расказанае бабуляй, помню і нясу праз усё жыццё:

**Ласачка**

– Ласачка, ласачка, дзе была?
– У Бога.
– Што там рабіла?
– Красёнцы ткала.
– Што зарабіла?
– Кусочак сала.
– А дзе тое сала?
– Кошка украла.
– А дзе кошка?
– Пабегла ў падпечак.
– А дзе той падпечак?
– Вадой заліло.
– А дзе вада?
– Валы папілі.
– А дзе валы?
– Доўбня ўбіла.
– А дзе доўбня?
– Чэрві патачылі.
– Дзе чэрві?
– Куры паклявалі.
– А дзе куры?
– Паляцелі на мора.
– А дзе мора?
– Красачкамі зарасло.
– Дзе тыя красачкі?
– Дзеўкі парвалі.
– А дзе дзеўкі?
– Хлопцы замуж пабралі.

– А дзе хлопцы?
– Пайшлі на вайну.
– А дзе вайна?
– Пасярод кучы г…ўна.

***

А яшчэ, калышучы Анютку, бабуля спявала:

Люлі-люлі-люлі,
Усе дзеці паснулі.
Не спіць толькі Коця,
Ходзіць па балоце.
Пайшоў коцік пад масток,
Злавіў рыбку за хвасток.
Ці самому есці,
Ці дзіцяці несці?
Я й сам трошкі ўкушу
І Анютцы занясу.

Люлі-люлі-люлі,
Пайшоў кот на гулі,
Памарозіў лапкі,
Палез на палаткі.
Сталі лапкі грэцца –
недзе катку дзецца.
Палез бы ён вышэй,
Ды баіцца мышэй.
Палез бы ён далоў,
Ды баіцца валоў.

Я, слухаючы, любіла ў душы гэтага бабулінага катка, спачуваючы яму. Хацелася неяк дапамагчы, каб не шчымелі ў яго лапкі…

З нявесткай (маёй мамай) яны жылі, пэўна, дружна. Не помню ні адной сваркі ці якой лаянкі. Відаць, іх і не было. Яшчэ казалі пра бабулю на вёсцы, што яна скупая. А яна часта дома гаварыла: “Скупая, хай скупая, абы не жадная. А хто скуп, той не глуп”.

Заўважаю, што бабуліна скупаватасць (я сказала б ашчаднасць) перадалася і мне (пэўна ж, на генным узроўні). І так, як яна, супакойваю сябе: “Хто скуп, той не глуп”.

Царства табе нябеснае, мая добрая, мая любая бабуля! У памяці маёй ты жывеш.

***

**Дзядзька Пеця**

Толькі таго і помню, што мой дзядзька Пеця памер раней, чым знішчылі нашу Гарожу. А калі? Чаго? Не ведаю.

Мама не хацела браць мяне з сабой на пахаванне. Потым чамусьці сказала, што возьме, але каб я не плакала там…

Дзядзька ляжаў на лаве пад абразамі. Доўгі. Твар быў апухлы, увесь чорна-сіні. Усе ціха плакалі, ціха размаўлялі.

Бабуля Мар'я ўзяла мяне за руку, падвяла да ўзгалоўя, да самага твару дзядзькі Пеці і загаласіла-запрычытвала. Я прытулілася да яе каленяў і заплакала, забыўшыся на маміны папярэджанні.

Потым везлі яго ў труне на кані, а мы ішлі следам. – У нашым канцы павярнулі налева і паўз лазовыя кусты – на могілкі.

Труну паставілі на ўзвышэнні пасярод капліцы. Гарэлі свечкі…

P.S. Мо, гэта магіла, якую мы даглядаем, што побач з брацкай магілай, дзе ляжыць уся наша радня, мо гэта, магіла дзядзькі Пеці?

Капліцу, што была на могілках, у вайну спалілі. Казалі, што спалілі партызаны. Але навошта? А звон з капліцы яшчэ доўга (у 1956-57 г.) вісеў на бярозе. А потым знік.

***

**Дужавы**

Дужавы жылі насупраць нас. Бабка Мар'я Дужыха – мая пупарэзная бабка. А з ёй жыў сын Міша з жонкай Арынай і іх дзеці – Віцька і Манька. Цётка Арына шыла людзям. У іх на сметніку часам валяліся розныя каляровыя прыгожыя абрэзачкі. Я збірала іх, яны былі мне вельмі патрэбны. Бо і я шыла: абшывала сваіх самаробных лялек. Лялек я шыла сама, сама размалёўвала ім твары бацькавым хімічным алоўкам (вочкі, роцік, носік, броўкі).

Часта хадзіла да Дужавых пагуляць. У Віцькі была вялікая лялька, якую яму сшыла маці. У Віцькі, бо Манька іхняя была яшчэ зусім малая і ў лялькі з намі не гуляла. Віцька заўсёды давал мне нагуляцца з лялькай. У лялькі былі прыгожыя сукеначкі, кофтачкі, спаднічкі. Была нават прыгожая хустачка-кашміроўка.

А яшчэ ў іх неяк з'явіўся патэфон. Тады, бывала, мы з мамай хадзілі да Дужавых паслухаць, як пяе патэфон. Вось тады я і пачула

першы раз “Кацюшу”. Песня вельмі спадабалася мне. Я ўсё снавала каля патэфона, які стаяў на табурэтцы, і вельмі шчыра заглядала ва ўсе дзірачкі, не разумеючы, дзе ж яна, гэта асляпляльна прыгожая Кацюша. Як яна там схавалася?

P.S. Ляжаць усе Дужавы ў адной магіле з маімі бацькамі і з усёй раднёй нашай. Думаю, што яны – наша радня. Бо Дужавы – гэта мянушка. А прозвішча іх Патапейка, як і ў нас (у мамы, у бабулі Мар’і)…

***

## Насця

Калі езджу ў сваю Вялікую Гарожу, то заходжу да яе абавязкова. Лёс звязаў нас назаўсёды. Яна засталася адна, і я засталася адна. У яе загінулі бацькі і радня, у мяне загінулі бацькі і радня. Толькі ёй было 17 гадоў, мне – пяць. Былі мы з ёй разам некалькі гадоў. Бо пасля трагедыі абедзве прыйшлі на пасёлак Акцябар. Мой дзядзька Міша быў жанаты на яе цётцы Агапе. Я прыйшла да дзядзькі, яна – да цёткі.

Потым была Грабавіца. Заставацца ў вёсцы, пасля таго, што нарабілася з Гарожай, Маем, Брыцалавічамі, людзі баяліся. Жылі ў зямлянках у лесе, ва ўрочышчы Грабавіца, недалёка ад партызанскага атрада.

Помню, як мы з Насцяй елі аднойчы малако з хлебам, па чарзе сёрбаючы яго з бутэлькі. Насці здалося, а мо так і было, што я глынула многа гэтага малака. Яна і заяўляе цётцы: “А Маня памногу каўтае”. Я ж якраз толькі набрала ў рот малака. Як яна сказала, што многа, я палавіну і выліла з роту назад у бутэльку. Падняўся крык, што зусім не будзе яна са мной піць. А мне што рабіць? Палыпала я вачыма ў разгубленасці ды й дапіла тое малако ўжо адна.

А потым у Грабавіцу прыйшла вясна. Вясна сорак трэцяга года. Растаў снег. Кругом багата талай вады. І ўсё навокал запаланілі пралескі. Мора пралесак, пралескавае мора. Блакітныя паляны.

Урочышча Грабавіца,
Глуш лясная –
Наша схованка ад фашыстаў.
І сюды заглянула вясна:
Ля жылля партызанаў
І ля нашых зямлянак
Красавік пралескі распрыскаў.

Ды столькі іх,
Што ні канца, ні краю!
У бахілах, дзяўчо малое,
Асцярожна ступаю
І збіраю пралескі, збіраю.
Сінь-блакіт
Да вачэй паднашу,
Кветачкамі махаю
І прашу – замаўляю:
– Будзьце, вочкі, як пралескі!
Будзьце, вочкі, як пралескі!
Будзьце, вочкі, як пралескі!
Пралескі, пралескі –
Сінія іскаркі смеху.
У глухамані лясной
Той ваеннай вясной
Былі радасцю мне і ўцехай.

З году ў год на ўзлесках
Красавік расыпае пралескі,
Іх у талай вадзе
Прыгажуня-вясна купае.
Шэсцьдзесят ужо мне,
Ды штогод па вясне
Я пралескі збіраю.
Збіраю.

Пралескі, пралескі –
Пяшчота роднага краю.

Верасень 1997 года

***

Да вайны мы былі суседзямі. Першай ад краю стаяла хата Санковічаў, Насціна хата, а цераз адну хату ад іхняй – наша. Калі забілі Гарожу, карнікі падпалілі дзве крайнія хаты. Яны і згарэлі. Астатнія хаты ўцалелі, пэўна тыдні на тры. 14 студзеня Насці не было дома, хадзіла да цёткі ў другую вёску. І засталася жывою. А бацькоў і двух сясцёр забілі. І згарэлі яны. Хаваць не было каго. Попел, попел, попел…

Насціны сёстры былі ўжо дзеўкі на выданні. Хараша вышывалі. Помню вышытыя навалкі, занавескі, падузорнікі ў іхняй хаце. Мне ўсё гэта вельмі падабалася.

А ў мяне была прыгожая кофтачка, вышытая рознакаляровымі кветачкамі шаўковымі ніткамі. Яе вышылі мне Санковічавы дзеўкі.

***

Гарацць дзве крайнія хаты…
Перад відовішчам гэтым
Пажару дагэтуль не бачыўшы,
Сярод вуліцы, у забітай маёй Гарожы
Адна, малая,
Шырока раскрыўшы вочы,
Зачараваная жахам, стаю.
А ў гэтым бушуючым пекле
Кідаецца і… галосіць сабака,
Жывы сабака… у полымі… на ланцугу…

Не адвяжа яго ніхто.
Гаспадыня ляжыць. Забілі.
І я не магу… не магу…
І па сённяшні дзень з таго
Пякельнага студзеня
Мне тое полымя ўваччу,
І над забітай маёй Гарожай,
І над Вялікай маёй Гарожай,
Над лёсам маім галосіць
Жывы сабака… у полымі… на ланцугу.

***

Пасля вайны Насця працавала ў калгасе. Жыла ў маленькай хатачцы, якую паставіў ёй дзядзька Міша на бацькоўскай сядзібе. Нарадзіла хлопчыка ў 1948 годзе. Той, ад каго нарадзіла, не схацеў яе ўзяць замуж. Але Бог яму суддзя.

Пазней Насця выйшла замуж за добрага чалавека Мішу Бяляўскага з Малой Гарожы. Нарадзіліся ячшэ ў іх дзве дачушкі. Пабудавалі яны з Мішам сабе прасторную хату замест той малюсенькай. Але жыць цяпер у ёй няма каму. Міша памёр. Дзеці

раз’ехаліся, жывуць у гарадах. А Насця адна жыве ў сваёй хаце на бацькавай сядзібе.

Я зайздрошчу Насці. Бо на нашай сядзібе жывуць чужыя людзі. А мяне туды цягне-цягне. Я помню сваю хату, свой двор, свой хлеў, ігрушку-дзічку, калодзеж…

І помню студзень 1943 года…

Жыву і помню.

***

Вспомним всех поименно,
горем вспомним своим…
Это нужно – не мертвым!
Это надо живым!

Р. Рождественский

У адной з брацкіх магіл пахаваны мае бацькі і радня – 43 чалавекі:

Патапейка Міша, жонка яго Анюта і трое дзяцей.

Патапейка Макар Захаравіч, жонка яго і трое дзяцей.

Галушка Іван і жонка яго Алеся.

Патапейка Міша, маці яго Мар’я, жонка яго Арына Сямёнаўна і дзеці Віцька і Манька.

Патапейка Лукер’я Іванаўна і трое дзяцей.

Патапейка Лявон Лявонавіч, жонка яго Надзея Іванаўна, Саша, Валодзя, Соня… (усяго семера дзяцей).

Костка Васіль Міхайлавіч, жонка яго Сцепаніда Агееўна.

Левановіч Клава, муж яе і двое дзяцей.

Альферовічы (мае родныя)

Павел Сцяпанавіч, - г.н. 1913 (з архіва)

Ніна Мікалаеўна, - г.н. 1917

Ганна Аляксееўна, бабуля мая

Ганна Паўлаўна (Анютка)

Патапейка Мар’я Змітраўна, нявестка яе Надзя, дзіця (хлопчык? дзяўчынка?). Гэта мая родная бабуля і Надзя – нявестка яе, жонка дзядзькі Пеці, мамінага брата, і дзіця.

Запіс зроблены 26 красавіка 1995 года
са слоў Насці Санковіч (Алёксавай).
Яна з маім дзядзькам Мішам ездзілі
на кані хаваць пабітых. Ей было

тады 17 гадоў.

в. Вялікая Гарожа

***

**Як хавалі Гарожу**

З успамінаў маёй траюроднай цёткі 77-гадовай Патапейка Паліны Іванаўны.

в. Малая Гарожа

…Страляюць, страляюць у Гарожы. Чуем страляюць… Думаем, што там робіцца? А тады бачым, гарыць з канца, з естага, дзе вы жылі… І ўжо нехта сказаў што ў Гарожы людзей пабілі… А у нас жа там радні багата… Ісці баімся. Толькі ходзім, ходзім на вуліцы, паглядаем у той бок…

А ў вечары Іван прыехаў на кані і Мішу раненага прывёз (сястрын мужык з сынам – М.Ц.). У Мішы з нізу ўвесь твар развалены… Іван жа, як стралялі, дык паваліўся на гуру снегу ля ганка. Так і ляжаў за нежывога, пакуль карнікі не пайшлі з двара… А Лукер’ю і дзевачак забілі…

…Хаваць жа не давалі доўга… Але людзі пазбіраліся, хто радня дзе якая, і пайшлі, і на конях паехалі. Ну, і мы з Жэняй пайшлі… Ідзём, а дзіка: вёска мёртвая. Людзі пабітыя, хто на дварэ ляжыць, хто ў хаце… Паўмярзалі ў снег… А халодна, а страшна! Ой-ой! Сумна…

…Сталі мужчыны ямы капаць на могілках. Збіраем людзей і возім. Цэлы абоз па вуліцы: вязуць, вязуць пабітых. Сумна!.. Яны ж скарчавелі, хто як упаў, так і ляжаць на вазах: дзе рукі, дзе ногі тырчаць… Плачам. А мужчыны не даюць плакаць: “Не смейце плакаць, няма калі!..”

Цэлы дзень вазілі… Міша наш, Пятровіч, дык братоў у шкап паклаў. А я Лукер’іну меньшанькую дзевачку, Маньку (мусіць твая равесніца), загарнула ў кашміраўку красівую, і паклала матцы на грудзі…

Клалі ж адзін на аднаго… Ямы шырокія-шырокія пакапалі… Дый грузім… Зверху пасцілкамі засцелем і тады ўжо засыпаем…

А па пуці паравоз ходзіць туды-сюды і трубіць, трубіць… Баімся, але ж робім гэту работу… Пахавалі да вечара. Ды й разышліся ўсе, засталася пустая Гарожа…

А дзён праз колькі бачым: гарыць Гарожа…

Усю спалілі…

Запіс зроблены 3 чэрвеня 1995 года,
в. Малая Гарожа

***

## Смаляначкі

Стаю перад вялікай магілай, дзе пахавана ўся мая радня. А справа ад магілы, трохі воддаль, цвітуць прыгожыя даволі высокія дробныя цёмна-ружовыя кветачкі. Смаляначкі. Так называюць іх у маёй вёсцы. Іх сцяблінкі, і лісцейка, і самі кветачкі пакрыты нечым ліпкім. Калі іх зрываеш, то гэтае нешта прыляпае да рук. Не, не так, як смала. Яно потым лёгка змываецца. Але – смаляначкі.

Растуць жэ недзе яшчэ гэтыя кветачкі. Але я іх нідзе больш не бачыла. Толькі тут, штогод.

З маленства. Смаляначкі. Яны тут, як на варце.

***

## Жоўтым полымем – жоўтыя кветкі

Пасёлак Май. Яго цепер няма. Ён у Хатыні, на могілках вёсак. Каля маёй Вялікай Гарожы, дзе ён быў да 14 студзеня 1943 года, яго няма. А ў маёй памяці ён жыве. Жыве, белым халодным снегам і жоўтымі кветкамі. І Кацяй Юлінай, якая ратавала нас з Мішам, калі мы замярзалі каля шашы.

14 студзеня 1943 года і ў маёй Гарожы і ў людзей Май пабілі. Самі вёскі спалілі ўжо пазней, пустыя.

Я ўжо сталы чалавек, жанчына якой пад шэсцьдзесят. Тады ж мне было ўсяго пяць. Але тая горкая памяць жыве ўва мне. Пячэ і трывожыць.

Еду ў Бабруйск аутобусам па шашы Бабруйск-Мінск. Тут паварот на брукаванку, што вядзе ў маю Вялікую Гарожу. А тут злева каля шашы быў пасёлак Май.

Ідзе аўтобус. А ў маёй памяці дзень 15 студзеня 1943 года. Мы з Мішам (мне пяць, яму гадоў восем) ідзем на пасёлак Акцябар. Двое малых дзяцей. Ісці кіламетры чатыры. Кругом белы халодны снег.

Бацькі нашы ляжаць дома, у Гарожы. Нам жа трэба ісці. Мы жывыя, мы ўцалелі. Але дайсці мы змаглі толькі да Мая. Потым селі каля дарогі. І ўжо замярзалі, калі нас падабрала Каця Юліна з Мая (са слоў людзей). Яна і прынесла мяне, паўжывую, на пасёлак Акцябар да дзядзькі.

***

Лета. Жанчыны і я з імі, і яшчэ дзяўчынкі з Акцябра ідзем у Гарожу, якой няма, ідзем на могілкі. Справа ад Брукаванкі – Май, якога няма. Толькі вуліца і высокі бур'ян… А сярод бур'яну, супрацьзгарэўшых сядзіб высокімі кустамі гараць жоўтыя кветкі. Языкамі жоўтага полымя глядзяць яны ў неба. І праз паўвека ў маёй памяці – студзеньскі пякучы снег і жоўтыя гарачыя кветкі.

У маём агародзе ёсць месца, дзе кожнае лета цвітуць такія ж жоўтыя кветкі – кветкі маёй горкай памяці. Гарацьі – і ледзяняць і апякаюць душу. Праз гады, праз усё жыццё. І так да скону.

07.03.1995 года




***

**<u>Забіты нямецкі лётчык</u>**

Ідзём у Гарожу. Некалькі жанчын і некалькі дзяўчынак. Цёплы дзень. Радаўніца. Ідзём на могілкі. Ад пасёлка Акцябра адышлі ўжо на кіламетр, перайшлі шашу Бабруйск-Мінск, ідзём па брукаванцы, пераходзім ад шашы метраў сто. Злева каля дарогі ляжыць забіты нямецкі лётчык. Нагамі на дарогу, галавой на абочыну, тварам уверх, рукі і ногі раскінуты ў бакі. Ён без камбінезона, толькі ў споднім. Цела яго набрыняла, абслізла. Ён непамерна тоўсты. Бялізна на ім палопалася. Мы спыняемся, стаім у яго ў нагах, стаім моўчкі. Помню, што ў мяне не было ніякіх эмоцый: ні жалю, ні злосці, ні крыўды, ні гідлівасці. Абыякавасць.

А зусім нядаўна, калі ўжо пачала пісаць гэтыя свае "засечкі" і прыкідваць у памяці, дзе тое месца, дзе мы сядзелі і замярзалі з

Мішам, памяць мая натыкнулася на факт, што на тым жа месцы ляжаў і той нямецкі лётчык. Што за містыка!?.

На радаўніцу сёлета спецыяльна паехалі па брукаванцы: хацела упэўніцца, ці так помню.

Так, усё так. Чаму гэта? Што гэта?

Містыка? Ці нейкая адплата?

30.06.1996 года

***

Вялікая Гарожа – любоў мая і сум,
Ты боль пякучы мой, ты боль мой несціханы.
Ніякі лекар-час не загаіў дасюль
Адной, крывавай той, той векапомнай раны.

Па якіх бы дарогах, сцяжынах якіх
Не вадзіў мяне лёс па маёй Беларусі,
Ты навек у душы, як удых, як уздых,
І з дарог, і з трывог да цябе я вярнуся.

Каб душою сваёй прыхінуцца к табе,
Ля лазовых кустоў зноў схіліцца ў скрусе,
Дзе штовесну цвіце, усё цвіце кураслеп
Саматканым бялюткім-бялюткім абрусам.

***

Хаты роднай няма,
У магіле радня,
Толькі дзічка старая ў полі
Зацвітае штогод –
Памінае наш род,
Абсыпаюччы квеценню голле.

Як прыеду, іду,
З ёй гаворку вяду,
Абдыму, як сястру, прывітаю.
Помнім я і яна
Боль зімовага дня
І трагедыю роднага краю.

Студзень 1995 года

***

Марыя Цімінская